Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 СНЕЖНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 232 (28090) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Дакументы для вандроўкі ў Ізраіль**

СТАР. 3



**Што чакае нафтавы рынак**

СТАР. 5

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Чым мы цікавыя Паўднёвай Амерыцы?**

## *ЛІЧБА ДНЯ*

**На 0,7%, або на $90,5 млн,**

*змяніўся знешні дзяржаўны доўг Беларусі (з улікам курсавых розніц) з пачатку 2015 года і па стане на 1 лістапада склаў $12,5 млрд, пра што паведамілі ў Міністэрстве фінансаў. У студзені-кастрычніку прыцягнуты знешнія дзяржаўныя пазыкі на суму $1 млрд 872,9 млн, у тым ліку $1 млрд 374,3 млн ад урада і банкаў Расіі, $445,5 млн — ад банкаў КНР, $53,1 млн — ад МБРР. Пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу з пачатку 2015 года склала $1 млрд 784,2 млн, з якіх выплаты па еўрааблігацыях — $1 млрд, Еўразійскаму фонду стабілізацыі і развіцця — $264,8 млн, ураду Расіі — $237,5 млн, банкам КНР — $129,9 млн, МВФ — $75,9 млн, банкам Венесуэлы — $56,6 млн, МБРР — $18,8 млн, ЗША — $0,7 млн.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18098,00 | ▼ |
| Еўра | 19144,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 270,88 | ▼ |
| Укр. грыўня | 762,02 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# КУПЧЭЛЬСКІ СНЕГАВІЧОК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сёстры Настасся і Таццяна ВЯЛІЧКІ з вёскі Купчэлі Браслаўскага раёна радуюцца першаму снегу.**

■ Купляем з розумам

## ДЗЕСЯЦЬ РАЗОЎ МЕР, І ТО НЕ ВЕР

### На што трэба абавязкова звяртаць увагу пры набыцці кватэры

**У прадаўцоў нерухомасці цяпер існуе нямала рознага кшталту хітрыкаў, якія дазваляюць усыпіць пільнасць кліента, паказаць жыллё ў больш выгадным святле, чым яно ёсць насамрэч. Асабліва калі тое ўжо добра зношана.**

### НЕ СТАЦЬ ГЕРОЕМ ПАСТАНОЎКІ



Часам пры набыцці кватэры на другасным рынку кліент адразу задаволены на ўсе 100% — дом няхай і немалады, але яшчэ трывалы; ціхі дворык; зусім побач крама і метро праз чатыры прыпынкі. Кватэра невялікая, але ўтульная, а самае галоўнае — недарагая для гэтага раёна. Аднак ужо праз пэўны час пасля здзелкі ружовыя акуляры з яго вачэй звальваюцца і новы гаспадар знаходзіць цэлы набор сур'ёзных недахопаў сваёй «ідэальнай» кватэры. Упэўнены, што на чужых памылках лепш вучыцца, чым на сваіх...

З'явіўся нават асобны маркетынгавы прыём — хоўм-стэйджынг (у перакладзе з англійскай мовы — хатняя інсцэніроўка, пастаноўка), якім прасунутыя гаспадары ўсё больш актыўна карыстаюцца для нівеліроўкі недахопаў не вельмі якаснай нерухомасці. Маніпуляцыя пакупніком часам пачынаецца на самых першых «прыступках», бо нават стан пад'езда мае значэнне.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## ЗІМА СТАРТУЕ МОКРЫМ СНЕГАМ І ДАЖДЖОМ

### Айчынныя спецыялісты падлічылі, што сярэдняя тэмпература на гэтым тыдні будзе на 3-5 градусаў вышэйшай за норму

**Увесь тыдзень на поўначы Еўропы будуць гаспадарыць атлантычныя цыклоны, якія перакрыюць паступленне халоднага арктычнага паветра. Таму пачатак снежня ў Беларусі прагназуецца цёплым і вільготным. Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Спецыяліст адзначыў, што будзе цёпла і ветрана, а сярэдняя тэмпература — на 3-5 градусаў вышэйшай за кліматычную норму. У аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць мокры снег і дождж. На асобных участках дарог галалёдзіца. Месцамі чакаецца ўзмацненне ветру да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да плюс 5 градусаў. У сераду па паўночным усходзе краіны прагназуецца кароткачасовы снег, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — ад нуля да 5 цяпла.

А з чацвярга стане яшчэ цяплей. Тады ажно да канца тыдня надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты далёкіх паўночных цыклонаў, яны прынясуць на нашу тэрыторыю сагрэтае Гальфстрымам цёплае і вільготнае паветра. Таму ў чацвер месцамі чакаецца невялікі дождж. У асобных раёнах туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, па паўднёвым захадзе — 1-3 цяпла, удзень — ад нуля да плюс 7 градусаў. Кароткачасовы дождж (часам з мокрым снегам) прагназуецца месцамі і ў пятніцу. Тэмпература паветра ўначы на пятніцу складзе 0 — плюс 5 градусаў, удзень — 1-7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, мокры снег з дажджом пройдзе і ў выхадныя. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 5 градусаў, удзень — да 5-7 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. kurkach@zviazda.by